View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



**УДК 94,438 (“1921-1939”)**

# ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ АГРАРНАГА ПЫТАННЯ Ў ПРАГРАМАХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1921 – 1939 гады)

***В.П. ГАРМАТНЫ***
***(Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца падыходы польскай гістарыяграфіі да вывучэння аграрнага пытання ў праграмах асноўных палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай (1921 – 1939 гады), ажыццёўлена яе перыядызацыя. Паказана актуальнасць і важнасць аграрнай праблемы, яе ўплыў на змену палітычнай сітуацыі ў Польшчы ў даследуемы перыяд. Адзначаны актыўная дзейнасць сялянскіх партый па ажыццяўленні аграрных пераўтварэнняў у краіне на карысць мясцовага сялянства, іх удзел у парламенцкай дыскусіі па разглядаемай праблеме і дачыненне да законаў аб аграрнай рэформе, якія прымаліся Соймам ІІ Рэчы Паспалітай.*

**Уводзіны.** На працягу ўсяго існавання ІІ Рэчы Паспалітай (1921 – 1939) аграрнае пытанне заставалася адным з самых злабадзённых і актуальных, ад вырашэння якога ў многім залежыў лёс Польскай дзяржавы ўвогуле. Па сваім значэнні аграрнае пытанне стаяла фактычна на адным узроўні з нацыянальным, цесна з ім спалучалася і ўзаемададаткоўвала яго, бо стаўленне да польскіх уладаў мясцовага сялянства ў многім залежыла ад вырашэння аграрнага пытання. Патрэба аграрнай рэформы ў Польшчы на пачатку 1920-х гадоў была настолькі відавочнай і тэрміновай, што ні адна з існуючых палітычных партый краіны не выступала супраць яе ажыццяўлення.

**Асноўная частка.** Польскую гістарыяграфію аграрнага пытання ў праграмах палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай у 1921 – 1939 гадах у залежнасці ад пануючых метадалагічных падыходаў і ацэнак можна падзяліць на тры асноўныя перыяды: 1) гістарыяграфія міжваеннага перыяду (1921 – 1939 гг.); 2) гістарыяграфія перыяду Польскай Народнай Рэспублікі (ПНР, 1952 – 1989 гг., фактычна з 1945 г.); 3) сучасная польская гістарыяграфія (пасля 1989 года).

Першай з польскіх навукоўцаў, хто разгледзеў аграрнае пытанне ў праграмах палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай, стала Аліцыя Бельцыкоўская [2], якая ў сваім даследаванні сістэматызавала праграмы асноўных тагачасных палітычных партый краіны на 1925 год. Варта адзначыць, што ў сувязі з тым, што аграрнае пытанне адыгрывала вызначальную ролю ў праграмах большасці тагачасных партый, іх месца ў палітычным жыцці краіны залежыла пераважна ад прапанаваных праектаў вырашэння аграрнага пытання. Аўтарка разглядаемай кнігі выдзеліла правыя (Народна-Нацыянальны Саюз, Związek Ludowo-Narodowy, польскія хрысціянскія дэмакраты, Chrześcijańska Demokracja і іншыя), партыі цэнтра (Polskie Stronnictwo Ludowe -“Piast”, Польская Народная Партыя-“Пяст”), левыя сялянскія (PSL-“Wyzwolenie”, ПНП – “Вызваленне”, Niezależna Partia Chłopska, Незалежная Сялянская Партыя, Chłopskie Stronnictwo Radykalne, Сялянскае Радыкальнае Аб’яднанне), левыя рабочыя партыі (Polska Partja Socjalistyczna, Польская Партыя Сацыялістычная) і палітычныя арганізацыі нацыянальных меншасцяў (Białoruski Klub, Беларускі Пасольскі Клуб, Białoruska Chrześcijańska Demokracja, Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя, Partja Białoruskich Socialistów-Rewolucjonistów, Беларуская Партыя Сацыялістаў-Рэвалюцыянераў).

Кніга А. Бельцыкоўскай з’яўляецца важкім унёскам у вывучэнне аграрнага пытання ў праграмах палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай на сярэдзіну 1920-х гадоў і да гэтага часу не страціла сваёй навуковай вартасці.

З усталяваннем у Польшчы сацыялістычнага ладу, асабліва з утварэннем у 1952 годзе ПНР, дзейнасць польскіх гісторыкаў па вывучэнню нядаўняга мінулага строга кантралявалася Польскаю Аб’яднанаю Рабочаю Партыяй (Polska Zjednoczona Partia Robotnicza), з-за чаго магчымасці навукоўцаў па аб’ектыўнаму даследаванню дзейнасці і праграм палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай былі істотна абмежаваны. Так, напрыклад, кніга вядомага тагачаснага вучонага, прафесара Чэслава Мадайчыка [20] прысвечана “буржуазна-памешчыцкай аграрнай рэформе ў Польшчы ў 1918 – 1939 гадах”. Аўтар кнігі з марксісцка-ленінскіх пазіцый класавай барацьбы падрабязна разгледзеў заканадаўчае афармленне аграрнай рэформы, яе галоўныя складовыя часткі і рэалізацыю, а таксама падыходы асноўных тагачасных палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай да вырашэння зямельнага пытання. Мадайчык адзначае вялікую ролю ў палітычным жыцці краіны сялянскіх партый ПНП-“Пяст” і ПНП-“Вызваленне” і адначасова зазначае, што азначаныя партыі выступалі за перамовы з абшарнікамі на шляху да вырашэння аграрнай праблемы і з мэтаю стрымаць рэвалюцыйны рух сялян заклікалі іх дачакацца вырашэння зямельнага пытання ў рамках закона, падкрэсліваючы пры гэтым, што “ані грамадзянскіх, ані сялянскіх правоў не здабудзеце

рабункамі і гвалтам (чытай рэвалюцыйнай барацьбой – *Ч. М.*), толькі здабудзеце грамадзянскім шляхам (праз Сейм)” [20, с. 101, 134].

Чэслаў Мадайчык падкрэсліваў, што адзінай партыяй у II Рэчы Паспалітай, на яго думку, сапраўды выступаючай у абарону інтарэсаў сялянства і дзякуючы якой “неслыхана ўзрасла класавая свядомасць сельскага пралетарыяту” [20, с. 222], была Камуністычная партыя Польшчы (Komunistyczna Partia Polski, КПП), якая арганізоўвала сялянскія выступленні супраць урадавай аграрнай палітыкі і прапаноўвала ажыццяўленне аграрных пераўтварэнняў па савецкаму прыкладу, шляхам умацавання рабоча-сялянскага саюза [20, с. 361] і далейшай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Камуністычная партыя Польшчы патрабавала перадачы сялянам памешчыцкай зямлі без усялякага выкупу і ліквідацыі памешчыкаў як класа [20, с. 353, 360], была адной з самых уплывовых на сялянства тагачасных еўрапейскіх камуністычных партый [20, с. 356].

Аўтар кнігі коратка распавядае пра дзейнасць і праграмы Незалежнай Сялянскай Партыі, Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (Białoruska Włościańsko-Robotnicza Hramada) і Украінскага Сялянска-Работніцкага Сацыялістычнага Адзінства (Сельроб, Ukraińskie Włościańsko-Robotnicze Zjednoczenie Socjalistyczne), якія выступалі ў цесным саюзе з КПП, і робіць выснову, што з’яўленне азначаных партый сведчыць аб тым, што “ленінскія лозунгі ў сялянскім пытанні былі магутным сродкам мабілізацыі сялянскіх мас і што Кастрычніцкая рэвалюцыя зрабіла для сялян сцяг сацыялізму асабліва прывабным” [20, с. 228]. Кніга Ч. Мадайчыка напісана на падставе вялікай колькасці архіўных крыніц, матэрыялаў перыядычнага друку і навуковых прац, але высновы ў працы зроблены даволі тэндэнцыйна і аднабока, што было выклікана пануючымі тады ў польскай гістарычнай навуцы метадалагічнымі падыходамі класавай барацьбы.

У цэлым з польскай гістарыяграфіі перыяду ПНР неабходна асабліва адзначыць гісторыка Анджэя Войтаса, манаграфія якога прысвечана менавіта вывучэнню аграрнай праблематыцы ў польскай грамадскай думцы ў 1918 – 1948 гадах [29]. Аўтар кнігі на базе шматлікіх даследаванняў і крыніц, найперш за ўсё матэрыялаў перыядычнага друку, грунтоўна прааналізаваў стаўленне да ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў палітычных партый II Рэчы Паспалітай у 1921 – 1939 гадах, але разам з тым прыйшоў да высновы аб адзіна правільным характары праграмы КПП.

Праца даследчыка Ежы Хользера [14] прысвечана палітычнаму жыццю ў II Рэчы Паспалітай, у кнізе падрабязна паказаны ўмовы дзейнасці галоўных тагачасных палітычных партый, іх сацыяльная базы і праграмы, адносіны да ўладаў і выступленні ў Сейме. Навуковец піша, што ў 1921 – 1939 гадах аграрная праблема была ў дзяржаве адной з самых важных і актуальных [14, с. 69 – 70], асабліва пытанне аб падзеле паміж сялянамі памешчыцкіх зямель. Хользер адзначае, што сялянскія партыі карысталіся ў грамадстве значным уплывам, асабліва ПНП-“Пяст” і ПНП-“Вызваленне” [14, s. 158], падкрэслівае, што, паводле яго меркаванняў, аграрная праграма ПНП-“Пяст” адпавядала ў першую чаргу інтарэсам заможнага сялянства і з цягам часу партыя эвалюцыянавала ў правым накірунку [14, с. 165]. Аўтар кнігі звяртае ўвагу, што найбольш радыкальнае становішча сярод тагачасных партый займала КПП, якая была апазіцыйнай не толькі адносна канкрэтнага дзяржаўнага ўрада II Рэчы Паспалітай, але і да ўсяго грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу краіны, выступала за перадачу малазямельным сялянам памешчыцкай зямлі без усялякага выкупа [14, с. 229].

У кнізе гісторыка Мар’яна Лечыка [18] даследаваны грамадска-палітычны лад II Рэчы Паспалітай у 1921 – 1939 гадах, адзначаецца, што аграрнае пытанне займала важнае месца ў праграмах палітычных партый. Сярод тагачасных палітычных арганізацый па іх адносінах да варыянтаў вырашэння ў краіне аграрнага пытання можна выдзеліць некалькі галоўных накірункаў: кансерватары (ННС) выступалі за правядзенне парцэляцыі (падзелу паміж сялянамі) безгаспадарчых і пустуючых зямель, не закранаючы асабліва памешчыцкае землеўладанне, сялянскія партыі імкнуліся да шырокага надзялення сялян памешчыцкай зямлёй праз выкуп, сацыялісты (ППС) прапаноўвалі перадачу памешчыцкай зямлі сялянам і гміннаму самакіраванню, камуністы выступалі за нацыяналізацыю памешчыцкіх зямель з перспектывай стварэння калектыўных гаспадарак [18, с. 126 – 146].

Пад кіраўніцтвам прафесара Стэфана Інглата польскімі навукоўцамі напісана грунтоўная трохтомная калектыўная праца па гісторыі польскага сялянства, у трэцім томе якой [13] разглядаюцца перыяд II Рэчы Паспалітай і час гітлераўскай акупацыі (1939 – 1945 гг.). Даследчыкі адзначаюць цяжкае становішча сельскай гаспадаркі краіны на пачатку 1920-х гадоў і актыўную дзейнасць тагачасных палітычных партый па вырашэнні аграрнай праблемы. З найбольш уплывовых на сялянства партый II Рэчы Паспалітай складальнікі называюць ПНП-“Пяст” і ПНП-“Вызваленне” [13, с. 231 – 239], сацыяльную базу якіх складалі самастойныя сяляне-гаспадары [13, с. 245], звяртаецца ўвага на невялікую колькасць сялян у шэрагах ППС, якая пазіцыянавала сябе як рабочая партыя [13, с. 243]. Як падкрэсліваюць аўтары-складальнікі, па бачанні неабходных аграрных пераўтварэнняў сяляне былі амаль аднадушнымі і патрабавалі ажыццяўлення парцэляцыі і камасацыі (хутарызацыі), ліквідацыі феадальных перажыткаў, найперш за ўсё сервітутаў, заклікалі сялян дачакацца прыняцця закона аб аграрнай рэформе [13, с. 252], а найбольш рады-

кальныя, прыхільнікі КПП і НСП, акрамя таго патрабавалі адзяржаўлення лясоў і вод [13, с. 255], адзначалі, што зрабіць гэта можа толькі рабоча-сялянская рэвалюцыя [13, с. 259 – 261].

У калектыўным зборніку “Палітычнае жыццё Польшчы ў 1918 – 1939 гг.” [30] паказаны ўмовы дзейнасці асноўных тагачасных палітычных партый і іх праграмы. Аўтары-складальнікі адзначаюць, што сялянскія партыі ігралі важную ролю ў палітычным жыцці II Рэчы Паспалітай у азначаны перыяд, падчас выбарчых кампаній у Сейм ішлі пад лозунгамі ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў і выступалі за перадачу сялянам памешчыцкіх зямель праз выкуп [30, с. 91 – 92]. У зборніку адзначаецца, што ў праграме ППС аграрнае пытанне адыгрывала другасную ролю ў параўнанні з рабочым, а ў цэлым партыя выступала за перадачу памешчыцкай зямлі сялянам і арганізацыю вёскі і сельскай гаспадаркі на прынцыпах кааперацыі [30, с. 84]. Што датычыць КПП, то камуністы выступалі за перадачу дзяржаўнай улады рабочым і сялянам і за ажыццяўленне ў II Рэчы Паспалітай пераўтварэнняў па савецкаму прыкладу, у тым ліку і ў сферы сельскай гаспадаркі [30, с. 44].

Аграрнаму пытанню ў праграме КПП у перыяд II Рэчы Паспалітай прысвечаны працы Х. Маліноўскага [21] і Х. Слабека [27]. Хенрык Маліноўскі ў сваёй кнізе раскрывае адносіны КПП да вырашэння аграрнага пытання ў пачатковы перыяд яе існавання (1918 – 1923 гг.), паказвае цяжкае становішча сельскай гаспадаркі краіны і палітычную сітуацыю на вёсцы. Даследчык адзначае, што КПП крытыкавала высунутыя іншымі партыямі праекты аграрнай рэформы і прапаноўвала ажыццяўленне пераўтварэнняў у сферы сельскай гаспадаркі па “ленінскай праграме” [21, с. 254 – 255]. У сакавіку 1922 года на III Канферэнцыі КПП прыняты “Аграрныя тэзісы” (Tezy Agrarny), паводле якіх прадугледжвалася адзяржаўленне маёнткаў “з высокай сельскагаспадарчай культурай” і падзел паміж сялянамі іншых фальваркаў [21, с. 215 – 216]. Асаблівую ролю ў выпрацоўцы адносін Кампартыі Польшчы да аграрнага пытання адыграў яе II З’езд (9 верасня – 2 кастрычніка 1923 года), які “прайшоў пад лозунгам "зямля – для сялян" і такім чынам заклаў падмурак рабоча-сялянскага саюза” [21, с. 318]. На з’ездзе было прынята рашэнне, што партыя будзе змагацца за перадачу сялянам памешчыцкіх зямель без усялякага выкупа з захаваннем адзяржаўленых вялікіх маёнткаў у прамысловых рэгіёнах [21, с. 300].

У даследаванні Хенрыка Слабекі [27] разгледжана аграрная палітыка і праграма Польскай Рабочай Партыі (Polska Partja Robocza) і яе папярэдніцы КПП у 1917 – 1948 гадах. Навуковец адзначае, што ў 1921 – 1939 гадах польскія камуністы выступалі за ажыццяўленне ў II Рэчы Паспалітай аграрных пераўтварэнняў па савецкаму прыкладу з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі, але на мяжы 1929 і 1930 гадоў як раз падчас выбарчай кампаніі ў Сейм II Рэчы Паспалітай 1930 года ў шэрагах польскага сялянства распаўсюдзіліся звесткі аб перагібах калектывізацыі ў Савецкім Саюзе, што было на карысць сялянскім партыям, з якімі КПП вяла барацьбу за ўплыў на сялянства [27, с. 75 – 77].

Даследчык Ежы Чэпялеўскі разгледзеў у сваёй працы [7] аграрнае пытанне ў праграмах палітычных партый II Рэчы Паспалітай, але вельмі фрагментарна. Аўтар кнігі паказаў цяжкае становішча сельскай гаспадаркі пасля першай сусветнай вайны (1914 – 1918 гг.), прааналізаваў заканадаўчае афармленне аграрнай рэформы і рэалізацыю ўрадавай аграрнай палітыкі. Гісторык адзначае існаванне ў дзяржаве ў 1921 – 1939 гадах вялікай колькасці сялянскіх партый рознай накіраванасці, што аслабляла іх палітычны ўплыў [7, с. 24, 31]. Сярод тагачасных палітычных партый у першую чаргу даследчыкам паказана аграрнае пытанне ў праграме Кампартыі Польшчы, адзначаецца станоўчая накіраванасць праграмы КПП, у той час як праграмы іншых партый ацэньваюцца як рэакцыйныя і ашуканцкія. Разам з тым Ежы Чэпялеўскі адзначае, што ў 1922 – 1923 гадах КПП зрабіла значныя памылкі – недаацэніла значэнне сялянства “як натуральнага саюзніка пралетарыяту ў барацьбе за сацыялістычную рэвалюцыю” [7, с. 23]. Змена ў адносінах камуністаў да сялянства назіраецца з ліпеня 1924 года, калі ў выніку расколу ў ПНП-“Вызваленне” ўзнікла новая партыя – Незалежная Сялянская Партыя (НСП), блізкая па духу і праграме да КПП [7, с. 35].

Гісторык Хенрык Цымек [8] разгледзеў дзейнасць легальных левых сялянскіх палітычных партый II Рэчы Паспалітай – НСП, Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады (БСРГ), Сельроб і іншыя, паказаў прапанаваныя імі праекты вырашэння аграрнага пытання, якія ў цэлым у многім супадалі з прапанаваным камуністамі: перадачы сялянам памешчыцкіх зямель бясплатна. Аўтар кнігі адзначае, што даследаваныя партыі дзейнічалі вельмі коратка, але дасягнулі значнага ўплыву на сялянства, асабліва ва ўсходніх ваяводствах [8, с. 113]. Цікавай з’яўляецца заўвага Х. Цымека пры аналізе сацыяльнага складу легальных левых сялянскіх партый, што паняцце найбяднейшае сялянства не заўсёды азначае найрадыкальнае, бо значную долю ў шэрагах азначаных партый і КПП складалі сяляне-серадднякі і нават заможныя вяскоўцы [8, с. 114].

Станіслава Ярэцкая ў сваёй манаграфіі ўпершыню комплексна разгледзела праграму і дзейнасць НСП у 1924 – 1927 гадах [16], адзначыла, што па аграрнаму пытанню НСП дабівалася перадачы памешчыцкіх зямель малазямельным і беззямельным сялянам без усялякага выкупу. Сацыяльную базу НСП складала сярэдняе і ў асноўным бяднейшае сялянства. Аўтар кнігі падкрэсліла, што праграма НСП была вельмі блізкая да праграмы КПП, і таму яна ацэньвае яе пазітыўна. Па сваёй праграме і сродкам дасягнення пастаўленых мэт НСП была настроена вельмі радыкальна і стала самай левай тагачаснай партыяй

пасля КПП, што не магло застацца з боку польскіх улад незаўважаным і прадвырашыла яе роспуск і забарону вясной 1925 года.

Ярэцкая адзначае, што НСП адмаўляла магчымасць супрацоўніцтва з іншымі сялянскімі партыямі, што рэзка зніжала магчымасці сумеснай палітычнай барацьбы за аграрную рэформу. Па ацэнцы гісторыка, прадстаўнікі НСП былі ў Сейме II Рэчы Паспалітай самымі актыўнымі, аб чым сведчаць сеймавыя стэнаграмы, у якіх зафіксаваны як мінімум штомесячныя прамовы паслоў (дэпутатаў) НСП [16, с. 84]. У цэлым, як паказвае даследчыца, з боку КПП дзейнасць і праграма НСП атрымалі станоўчую ацэнку, але калі для НСП падзел памешчыцкай зямлі паміж сялянамі быў мэтай, то для КПП толькі сродкам знішчэння памешчыкаў як класа і ўмовай пашырэння саюза з сялянствам [16, с. 111].

Незалежнай Сялянскай партыі прысвечана таксама манаграфія Бенона Дымека [10], які разгледзеў яе праграму і дзейнасць больш падрабязна. Навуковец прааналізаваў праграму НСП, адзначыў, што па аграрнаму пытанню партыя выступала за бясплатнае надзяленне сялян канфіскаванай у памешчыкаў зямлёй і ў адрозненне ад большасці тагачасных партый НСП даволі крытычна адносілася да парламенцкіх метадаў дзейнасці, падкрэслівала, што даць сялянам зямлю зможа толькі рабоча-сялянскі ўрад. Разам з тым прадстаўнікі сеймавага клуба НСП вельмі актыўна выкарыстоўвалі трыбуну Сейма ў барацьбе за ажыццяўленне аграрнай рэформы на карысць бяднейшага сялянства, падрыхтавалі і ўнеслі ў парламент летам 1925 года разам з сеймавымі фракцыямі КПП і БСРГ праект закона аб аграрнай рэформе [10, с. 84], які прадугледжваў перадачу сялянам памешчыцкай зямлі, але праект не быў падтрыманы пераважнай большасцю. 20 ліпеня 1925 года Сеймам прыняты ўрадавы закон аб аграрнай рэформе, які прадугледжваў выкуп сялянамі зямлі ў памешчыкаў, што супярэчыла спадзяванням левых.

Палітычную дзейнасць сялянскіх партый II Рэчы Паспалітай у 1921 – 1939 гадах даследаваў Ежы Баркоўскі [3; 4]. Навуковец падкрэслівае, што азначаныя партыі выступалі за ажыццяўленне аграрнай рэформы ў рамках існуючага ў краіне заканадаўства і адмаўлялі шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Галоўнай мэтай польскіх сялянскіх партый у справе аграрнай рэформы было ажыццяўленне парцэляцыі абшарніцкіх зямель [3, с. 69], але іх падыходы розніліся ў справе вызначэння максімума памешчыцкага землеўладання і памеру выкупу сялянамі лішкаў. У 1931 годзе сялянскія партыі II Рэчы Паспалітай здолелі аб'яднацца і ўтварыць новую арганізацыю – "Stronnictwo Ludowe" (Народная Партыя), якая пастанавіла дабівацца правядзення парцэляцыі памешчыцкіх зямель на карысць сялянства [4, с. 314].

У кнізе даследчыка Вейслава Бюргера [6] разгледжаны адносіны сялянскіх палітычных арганізацый да галоўных пытанняў грамадска-палітычнага ладу II Рэчы Паспалітай. Як ужо адзначалася вышэй, у 1921 – 1939 гадах у польскай дзяржаве існаваў цэлы шэраг сялянскіх партый, якія вялі актыўную палітычную агітацыю сярод сялянства, выказвалі сваё стаўленне да тагачасных актуальных праблем дзяржаўнага ладу, і найперш за ўсё, зразумела, наконт пераўтварэнняў у сферы сельскай гаспадаркі краіны. Даследчык паказвае эвалюцыю аграрнага пытання ў праграмах сялянскіх палітычных партый, паказвае іх удзел у парламецкіх дыскусіях па пытанню зямельнай рэформы і адносіны да прынятых Сеймам II Рэчы Паспалітай аграрных законаў.

Аўтар кнігі адзначае, што галоўным патрабаваннем сялянскіх арганізацый было ажыццяўленне парцэляцыі, але ў адносінах да яе коштаў і вызначэння максімума ўладання зямлёй стаўленне партый розніласяі [6, с. 168 – 169]. У 1931 годзе найбольш уплывовыя сялянскія партыі (ПНП-"Пяст", ПНП-"Вызваленне", "Сялянская Партыя") змаглі дасягнуць кампрамісу і аб'яднацца ў "Народную Партыю", якая паставіла мэту прыняцце дзяржавай комплекснага гаспадарчага плана, які б забяспечыў далейшае развіццё сельскай гаспадаркі краіны, ліквідацыю "нажніц цэн" (значнай перавагі коштаў на прамысловыя тавары над сельскагаспадарчымі), арганізацыю ў дзяржаве адзінага сельскагаспадарчага рынку, выкарыстанне штучных угнаенняў [6, с. 185 – 186]. Аўтар кнігі адзначае, што польскія палітычныя партыі дзейнічалі ў адзіным рэчышчы з сялянскімі партыямі іншых еўрапейскіх краін, а ў цэлым іх праграмныя патрабаванні былі рэалізаваны польскім урадам толькі часткова [6, с. 414].

Зыгмунт Хеммерлінг у сваіх працах разгледзеў сялянскі рух II Рэчы Паспалітай, Балгарыі і Чэхаславакіі ў 1893 – 1930 гадах [12] у барацьбе за ажыццяўленне аграрнай рэформы. Гісторык падкрэсліў вызначальную ролю ў польскім сялянскім руху ПНП-"Пяст", якую ён адносіў да партый цэнтру, і ПНП-"Вызваленне", якая адносілася да левых сіл [12, с. 185]. ПНП-"Вызваленне" мела больш радыкальную аграрную праграму, але ў цэлым азначаныя партыі па сваіх мэтах былі блізкімі і выступалі за ажыццяўленне ўрадам шэрагу аграрных пераўтварэнняў, мэтай якіх было стварэнне дробных сялянскіх заможных гаспадарак, на якія магла б абаперціся ў будучым дзяржава [12, с. 186, 194]. Аўтар разглядаемай кнігі адзначае, што сялянскія партыі II Рэчы Паспалітай, у адрозненне ад Балгарыі і Чэхаславакіі, былі ідэалагічна і арганізацыйна разадзіночанымі, што зніжала іх уплыў у грамадстве – так, за 1921 – 1939 гады адзіным сялянскім палітыкам, які стаў прэм'ер-міністрам II Рэчы Паспалітай, быў лідар ПНП-"Пяст" Вінцэнт Вітас (Wincent Witos). Вітас займаў пасаду старшыні ўрада тройчы, але толькі на працягу другога тэрміну меў час, каб ажыццявіць прапагандаваныя ідэі на практыцы [12, с. 432 – 433].

Ян Яхумек разгледзеў палітычную думку ПНП-“Вызвалення” у 1918 – 1931 гадах [15], адзначыў, што галоўным патрабаваннем партыі па аграрнаму пытанню было ажыццяўленне парцэляцыі, але па ацэнцы выкупа за зямлю партыйныя дзеячы значна разыходзіліся ў сваіх меркаваннях [15, с. 42 – 43]. Прадстаўнікі “Вызвалення” падкрэслівалі, што ў сферы сельскай гаспадаркі ў Польшчы ў гэты час неабходна было правесці замену пераважна памешчыцкай формы вытворчасці на больш сучасную і трывалую – “дробную асабістую гаспадарку”. Перабудову аграрных адносін неабходна ажыццяўляць паступова, галоўную яе частку павінна была складаць парцэляцыя, дапаможную – камасацыя, меліярацыя, ліквідацыя сервітутаў, а таксама ільготнае крэдытаванне і падаткаабкладанне [15, с. 56, 65]. Варта адзначыць, што меркаванні ПНП-“Вызваленне” былі пазітыўна ўспрыняты польскімі дзяржаўцамі і знайшлі сваё адлюстраванне ў прынятых законах аб аграрнай рэформе.

Аляксандр Лучак у сваім даследаванні [19] адзначаў, што сялянскія партыі змагаліся за тое, каб сяляне занялі адпавядаючае ім месца ў палітычным жыцці ІІ Рэчы Паспалітай і найперш за ўсё атрымалі ва ўладанне зямлю, з якой яны кормяцца і якая “з’яўляецца не толькі эканамічнаю…, але і маральнаю, і грамадскаю вартасцю” [19, с. 22 – 25, 196].

Аліцыя Венжыкоўская напісала кнігу аб дзейнасці “Сялянскай Партыі” (Stronnictwo Chłopskie, 1926 – 1931 гг.) [28], якая, па яе ацэнках, мела антыпамешчыцкі і антыкапіталістычны характар, карысталася сярод сялянства высокай папулярнасцю; аўтар паказвала сябе як абаронцу ўсяго сялянства, а па аграрнаму пытанню выступала за апору польскай дзяржавы на дробныя сялянскія гаспадаркі і перадачу зямлі ў рукі тых, хто на ёй працуе. Для гэтага неабходна была ліквідацыя сервітутаў на выгадных для сялян умовах і перадача ім без выкупа памешчыцкіх зямель [28, с. 93]. Неабходна адзначыць, што праграме “Сялянскай партыі” гісторык адвяла мала ўвагі і ў асноўным распавядала пра яе дзейнасць.

Кніга Францішка Паствы прысвечана даследаванню аграрнага пытання ў праграмах польскіх рабочых партый у 1878 – 1945 гадах [23]. Аўтар кнігі адзначае, што адной з самых уплывовых тагачасных партый ІІ Рэчы Паспалітай была ППС, якая за 1921 – 1939 годы перажыла некалькі расколаў і змен праграмы. На XXIV Кангрэсе партыі (1920 г.) была прынята аграрная праграма, якая прадугледжвала перадачу сялянам памешчыцкай зямлі і інвентару бясплатна, падтрымку з боку ўрада грамадскім і дзяржаўным гаспадаркам [23, с. 51 – 52]. Даследчык падкрэслівае, што вялікую дыскусію ў шэрагах КПП выклікала пытанне адносін да селяніна-серадняка і яго месца ў рэвалюцыйным руху [23, с. 65], адзначае частыя змены адносін ЦК КПП да спраў сельскай гаспадаркі, што было абумоўлена пераменамі палітычнага становішча ў дзяржаве, і абцяжарвала магчымасць выпрацоўкі аграрнай праграмы, дэзарганізавала шэраговых членаў партыі і змяншала ўплыў камуністаў на сялянства [23, с. 68].

У артыкуле Шымана Рудніцкага [26] разглядаецца дзейнасць Нацыянальна-Хрысціянскай Аграрнай Партыі (Chrześcijańsko-Narodowe Stronnictwo Rolnicze, НХАП), якая прадстаўляла інтарэсы памешчыкаў. Партыя падкрэслівала, што інтарэсы землеўласнікаў, у тым ліку і сялян, незалежна ад памеру ўладання зямлі, аднолькавыя, і таму трэба сумесна дзейнічаць у справе іх абароны [26, с. 187]. На першым плане ў праграме НХАП стаялі эканамічныя інтарэсы сельскай гаспадаркі [26, с. 304]. Да прынятага Сеймам Закона аб аграрнай рэформе (зацверджаны Сенатам 28 снежня 1925 года) НХАП аднеслася адмоўна і лічыла яго здрадай з боку ННС [26, с. 191].

Больш свабоднае і ўсебаковае вывучэнне разглядаемага пытання ў польскай гістарыяграфіі стала магчымым з 1989 года, з паслабленнем ідэалагічнага кантролю за дзейнасцю гісторыкаў. Чэслаў Бжоза падрабязна разгледзеў перыяд ІІ Рэчы Паспалітай і другой сусветнай вайны (1918 – 1945 гг.) [5], асаблівую ўвагу аўтар кнігі надаў палітычнай гісторыі краіны ў 1921 – 1939 гадах: правёў сістэматызацыю тагачасных палітычных партый па іх праграмах, паказаў іх дзейнасць у Сейме ў справе заканадаўчага афармлення аграрнай рэформы. Даследчык адзначае, што большасць тагачаснага насельніцтва дзяржавы складала менавіта сялянства і аграрнае пытанне займала ў праграмах тагачасных палітычных арганізацый вельмі важнае месца. Варта падкрэсліць, што гісторык не абмінуў увагай партыі нацыянальных меншасцяў, найперш за ўсё заходнебеларускіх (БХД, БСРГ, БСС) і заходнеўкраінскіх, і дзейнасць палітычных партый ІІ Рэчы Паспалітай.

У даведніку “Польскія партыі і грамадска-палітычныя рухі першай паловы XX стагоддзя” [25] выкладзены звесткі аб праграмах і дзейнасці асноўных палітычных арганізацый ІІ Рэчы Паспалітай. Аграрнае пытанне займала значнае месца ў праграмах тагачасных палітычных партый, але некаторыя з іх выразна пазіцыянавалі сябе як сялянскія (ПНП-“Пяст”, ПНП-“Вызваленне”) [25, с. 113]. Адной з галоўных праблем дзяржавы заставаўся зямельны голад, які можна было вырашыць праз надзяленне сялян памешчыцкаю зямлёй, але падыходы партый у гэтым пытанні вельмі розніліся [25, с. 29, 168].

У кнізе З. Хеммерлінга падрабязна даследавана дзейнасць ПНП-“Вызваленне” ў Сейме ІІ Рэчы Паспалітай у 1919 – 1931 гадах [11], адзначана, што партыя звяртала вялікую ўвагу на становішча сельскагаспадарчых рабочых, а галоўным лозунгам партыі быў “зямля для сялян, улада для сялян, асвета для сялян”, з якіх самым галоўным было патрабаванне надзялення сялян зямлёй праз парцэляцыю памешчыцкіх маёнткаў [11, с. 91, 95]. Прадстаўнікі “Вызвалення” ў маі 1924 года выступілі з тэрміновым праектам

ажыццяўлення аграрнай рэформы, у якім прапаноўвалі перадачу зямлі на карысць дзяржавы, што з'яднае з ёю грамадзян. Прапанаваны праект выклікаў вялікую дыскусію наконт кошту выкупа зямлі [11, с. 165]. Праект быў перададзены на разгляд Зямельнай камісіі (Komisji Rolnej) Сейма, і многія яго пастулаты ўвайшлі ў прыняты 28 снежня 1925 года Закон аб аграрнай рэформе.

Праца даследчыцы Крысціны Гамулкі [1], прысвечаная месцу Беларусі ў канцэпцыях польскіх палітычных партый у 1918 – 1922 гадах, перакладзена на беларускую мову. Аўтар кнігі звяртае ўвагу на тое, што абсалютную большасць тагачаснага заходнебеларускага насельніцтва складалі сяляне, таму ад вырашэння аграрнага пытання шмат у чым залежыў лёс польскага панавання на новадалучаных землях. Актыўную дыскусію польскія партыі вялі ў азначаны перыяд адносна насаджэння на землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны вайсковых асаднікаў – ветэранаў Савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гадоў, якія атрымоўвалі зямельныя надзелы за свае баявыя заслугі.

Войцэх Мілеўчык у сваім артыкуле [22] разгледзеў аграрнае пытанне ў праграмах польскіх палітычных партый у 1918 – 1925 гадах, ажыццявіў аналіз і сістэматызацыю партый па іх адносінах да варыянтаў вырашэння ў II Рэчы Паспалітай аграрнага пытання: нацыянал-дэмакратычныя (Народна-нацыянальны Саюз), кансерватыўныя (НХАП), хрысціянска-дэмакратычныя (польскія хрысціянскія дэмакраты), сялянскія (ПНП-"Пяст", ПНП-"Вызваленне") і сацыялістычныя (ППС, КПП).

У кнізе Хенрыка Цімека абмеркавана барацьба сялянскіх партый у справе межаў і грамадска-палітычнага ладу Польшчы ў 1914 – 1922 гадах [9], паказана іх дыскусія па праектах зямельнай рэформы ў Заканадаўчым Сейме і выпрацоўка імі сваёй палітычнай праграмы і найперш за ўсё аграрнага пытання.

Сярод сучасных польскіх даследчыкаў неабходна асабліва адзначыць Эвеліну Падгайну, кніга якой прысвечана "Сялянскай партыі" [24]. Паводле яе меркаванняў, адназначна акрэсліць праграму партыі немагчыма, але ў цэлым партыя выступала за ажыццяўленне аграрных пераўтварэнняў (найперш за ўсё парцэляцыі і камасацыі), дзякуючы якім павінна была паўстаць "сучасная Польшча" [24, с. 179].

Артыкул Роберта Ключэка прысвечаны ацэнцы сялянскімі партыямі ПНП-"Пяст" і ПНП-"Вызваленне" гаспадарчай палітыкі ўрада Уладзіслава Грабскага (1923 – 1925 гг.) [17], які стаў адным з распрацоўшчыкаў закона аб аграрнай рэформе ад 28 снежня 1925 года.

Аўтар разглядаемага артыкула адзначае, што дзейнасць урада У. Грабскага азначанымі партыямі ў цэлым ацэнена станоўча, як адпавядаючая асноўным патрабаванням іх аграрнай праграмы [17, с. 94].

**Заключэнне.** У польскай гістарыяграфіі аграрнае пытанне ў праграмах палітычных партый у перыяд існавання II Рэчы Паспалітай (1921 – 1939 гг.) вывучана даволі падрабязна і ўсебакова, раскрыты асноўныя падыходы партый да ажыццяўлення пераўтварэнняў у сферы сельскай гаспадаркі, разам з тым застаюцца слаба вывучанымі праграмы партый нацыянальных меншасцяў, прынамсі заходнебеларускіх.

Палітычныя партыі II Рэчы Паспалітай вялі актыўную барацьбу па схіленню на свой бок сімпатый сялянства, асабліва падчас выбарчых кампаній у Сейм, выступалі са сваімі праектамі вырашэння аграрнага пытання ў перыядычным друку, выпускалі лістоўкі, брашуры, адозвы. Абсалютная большасць тагачасных палітычных партый прызнавала неабходнасць надзялення сялян зямлёй, але іх падыходы розніліся ў справе вызначэння максімума ўладання зямлёй і кошту выкупа яе ў памешчыкаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй: Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918 – 1922) / К. Гамулка. – Вільня: Gryf, 2008. – 256 с.
2. Bełcikowska, A. Stronnictwa i związki polityczne w Polsce: characterystyki, dane historiczne, programy, rezolucje, organizacje partyjne, prasa, przywódcy / A. Bełcikowska. – Warszawa: Dom Książki Polskiej, 1925. – 1086 s.
3. Borkowski, J. Ludowcy w II Rzeczypospolitej: w 2 częściach / J. Borkowski. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1987. – 374, 411 s.
4. Borkowski, J. Postawa polityczna chłopów polskich w latach 1930 – 1935 / J. Borkowski. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1970. – 475 s.
5. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodległości i Drugiej Wojny Światowej (1918 – 1945) / Cz. Brzoza. – Kraków: Fogra, 2001. – 424 s.
6. Burger, W. Ruch ludowy wobec kwestii społeczno-ustrojowych II Rzeczypospolitej / W. Burger. – Szczecin: Dział Wydawnictw WSM, 1983. – 414 s.
7. Ciepielewski, J. Stronnictwa i partie polityczne wobec kwestii rolnej i chłopskiej w Polsce międzywojennej / J. Ciepielewski. – Warszawa: Centralna Szkoła Partyjna przy KC PZRP, 1969. – 71 s.
8. Cimek, H. Legalne chłopskie partie rewolucyjne w Drugiej Rzeczypospolitej / H. Cimek. – Białystok, Krajowa Agencja Wydawnicza, 1988. – 157 s.
9. Cimek, H. Walka ludowców o Polskę, jej granice i ustróju w latach 1914 – 1922 / H. Cimek. – Rzeszów, Wydawnictwo Uniwersytetu Rzeszowskiego, 2008. – 344 s.

10. Dymek, B. Niezależna Partia Chłopska (1924 – 1927) / B. Dymek. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1972. – 455 s.
11. Hemmerling, Z. PSL "Wyzwolenie" w parlamentach II Rzeczypospolitej, 1919 – 1931 / Z. Hemmerling. – Warszawa: Ośrodek Badań Społecznych, 1990. – 337 s.
12. Hemmerling, Z. Ruch ludowy w Polsce, Bułgarii i Czechosłowacji, 1893 – 1930 / Z. Hemmerling. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1987. – 453 s.
13. Historia chłopów polskich: w 3 tomach. T. 3. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej; pod redakcją Stefana Inglota. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – 715 s.
14. Holzer, J. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1974. – 670 s.
15. Jachymek, J. Myśl polityczna PSL Wyzwolenie 1918 – 1931 / J. Jachymek. – Lublin: Wydawnictwo Lubelskie, 1983. – 324 s.
16. Jarecka, St. Niezależna Partia Chłopska (1924 – 1927) / St. Jarecka. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1961. – 184 s.
17. Kluczek, R. PSL "Piast" i PSL "Wyzwolenie" wobec polityki gospodarczej rządu Władysława Grabskiego w latach 1923-1925 / R. Kluczek // Roczniki z Dziejów Ruchu Ludowego. – 1998. – № 30. – S. 77 – 94.
18. Leczyk, M. Oblicze społeczno-polityczne Drugiej Rzeczypospolitej / M. Leczyk. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1988. – 506 s.
19. Łuczak, A. Społeczeństwo i państwo w myśli politycznej ruchu ludowego II Rzeczypospolitej / A. Łuczak. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1982. – 272 s.
20. Madajczyk, Cz. Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918 – 1939) / Cz. Madajczyk. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1956. – 465 s.
21. Malinowski, H. Program i polityka rolna KPRP (1918 – 1923) / H. Malinowski. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1964. – 348 s.
22. Mielewczyk, W. Die Agrarfrage im Programm von Parteien und politischen Organisationen in Großpolen 1918 – 1925 / W. Mielewczyk // Studia historicæ-economicæ. – № 27. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2009. – 332 s.
23. Pastwa, F. Przebudowa rolnictwa w koncepcjach polskich partii robotniczych (1878 – 1945) / F. Pastwa. – Zielona Góra: Wyższa Szkoła Pedagogiczna, 1987. – 100 s.
24. Podgajna, E. Stronnictwo Chłopskie (1926 – 1931). Studium z dziejów myśli politycznej / E. Podgajna. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2011. – 276 s.
25. Polskie partie i ruchy społeczno-polityczne pierwszej połowy XX wieku / redakcja naukowa Kazimierz Przybysz. – Warszawa: Oficyna Wydawnicza ASPRA-JR, 2010. – 328 s.
26. Rudnicki, Sz. Chrześcijańsko-Narodowe Stronnictwo Rolnicze / Sz. Rudnicki // Zemiaństwo poskie, 1795 –1945. – Warszawa, Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1985. – 312 s.
27. Słabek, H. U podstaw polityki rolnej PPR w dziedzinie przebudowy ustroju rolnego (1917 – 1948) / H. Słabek. – Warszawa: WSNS przy KC PZRP, 1964. – 292 s.
28. Więzikowa, A. Stronnictwo Chłopskie, 1926 – 1931 / A. Więzikowa. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1963. – 288 s.
29. Wojtas, A. Problematyka agrarna w polskiej myśli politycznej 1918 – 1948 / A. Wojtas. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1983. – 484 s.
30. Życie polityczne w Polsce 1918 – 1939 / Wszechnica Polskiej Akademii Nauk; red. tomu Janusz Żarnowski. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, Wydawnictwo PAN, 1985. – 342 s.

*Паступіў 03.12.2012*

**POLISH HISTORIOGRAPHY OF AGRARIAN QUESTION IN THE PROGRAMMES OF II RZECZPOSPOLITA POLITICAL PARTIES IN 1921 – 1939**

***V. HARMATNY***

*The approaches of polish historiography to studying of agrarian question in the programmes of the II Rzeczpospolita main political parties (1921 – 1939) are considered, its periodization is made, urgency and importance of the agrarian problem, its role on the changes of political situation in Poland in that times are shown. Attention is paid to the activity of peasant parties for the realization of agrarian changes in the country in favour of the local peasantry, their participation in parliamentary discussion on the given problem and attitude to the laws about the agrarian reform passed by the Seim of the II Rzeczpospolita.*